На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

№ 123 (705)
Пятніца, 9 ліпеня 1999 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень

Народная Воля

Кошт: у кіёсках і крамах — 20000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Анатоль ЗЭКАЎ

На станцыі "Няміга"

Роздум на 40-ы дзень пасля трагедыі, што здарылася 30 мая 1999 года.

Да той бяды за паўгадзіны
І я тут быў, і піва піў...
Чаму зараз вас пакінуў?
Чаму сабой не захіліў?
Ах, каб знаццё,
што ўсё так будзе.
Ды хто тады па гэта знаў.
То ж мы цяпер сабе ўсе судзім,
Каб зразумець, чыя віна,
Бо ёй, як стрэмкі,
ў кожным сэрцы
Балючай ранаю смылець.
Нам з ёю жыць і з ёй памерці,
Каб Там нас пасля ўсіх вас сустрэць.
Той вечар разам будзем згадваць
(Чаму ашчуваўся, што звер?),
І мы ад вас пачуем праўду,
Якой не кажуць нам цяпер.
А праўда ёсць, яна не тая,
Што бачаць розныя чыны
І бачна сёння замятаюць
Сляды ўласнае віны.
А праўда ёсць, не ўтоіш праўду,
Яна адкрыецца сама,
Бо хіба ж вы ў тым вінаваты,
Што з нашых вас цяпер няма!
Пра тое, хто там быў няправы,
На жаль, ужо жывым судзіць...
Табе не сорамна, дзяржава,
Тым, што загінулі, маніць?

Абсурд

Ох, и трудно быть буржуем

Как живется сегодня простым людям, особенно пенсионерам, ветеранам войны и труда? Об этом нередко они пишут сами, и мы публикуем их письма, полные горечи и боли за то нищенское существование, на которое обрекло их государство в награду за десятки лет честного труда ради "светлого будущего".

Семен Дубровский — наш читатель и автор из Солигорска, тоже пенсионер (его публикация "Неужто опять, Господи", наверное, запомнилась многим) затрагивает острую, болезненную тему с несколько иной стороны. На собственном опыте, скрупулезно и доказательно рассматривает он пример "заботы" власти предержащих о тех самых пенсионерах, которые, по идее, должны быть осчастливлены этой заботой.

Репортаж С.Дубровского "Ох, и трудно быть буржуем" читайте на 2-й странице.

Крык душы

Даношваем тое, што не з'ела моль...

Скажаце, перабольшваю? Многія вяскоўцы майго ўзросту пацвердзяць тое. Здавалася, ужо ніколі не будзе таго, што ў маладую пару давялося перажыць ваенным ліхалеццем і ў першыя гады пасля. А вось выходзіць, усё вяртаецца.

Паслухаеш наша радыё, выступы Аляксандра Рыгоравіча, дык за галаву бярэшся. Колькі ж можна хлусіць, абяцаць, і на каго разлічана ўсё гэта? Аднаго, праўда, не адмаўляю: пенсію нам прыносяць рэгулярна. Ды што на яе можна прыдбаць, як пражыць? Трымаеш у руках стос паперак, а яны ж — пустыя. На нашы 3—4 пенсійныя мільёны толькі хлеб ды малако купіш, ну яшчэ крыху кармоў для жыўнасці. Вось і даводзіцца латаць старое аддзенне, а хадзіць хутка будзем басанож. Праўда, летам ды яшчэ па расе — гэта на карысць здароўю.

Дык вось, Аляксандр Рыгоравіч, пры тваім прэзідэнцтве намнога пагоршала нам жыць. І надзеі на лепшае няма. Хоць да голаду і холаду, я ўжо гаварыла, нам не прывыкаць, але прывыкнуць да несправядлівасці, што ідзе зверху па "вертыкалі", немагчыма. За слова праўды можна ў турму загрымець, ці не так? Вы і вашы памагатыя толькі тых церпіце, хто вам дагаджае, лісліваіць перад вамі. А разумных, гаспадарлівых людзей да кіраўніцтва не дапускаеце. Адкуль жа будзе лад у краіне? Вы ўсё запэўніваеце, што ў адной дзяржаве з Расіяй будзем песенькі спяваць, а ці не давядзецца плакаць? Там жа парадкі і справы не лепшыя за нашыя, па РТР і ГРТ такога наглядзеліся, што відавочна: аб'яднанне голага з босым нічога добрага не дасць.

Навошта ж зноў дарэмна абнадзейваць людзей? Нават мне, не надта адукаванай вяскоўцы, зразумела, што ў невялікай дзяржаве, як зараз Беларусь, лягчэй зладзіць жыццё па-добраму, чым у бяскрайняй і ўзбаламучанай Расіі. Магу прывесці такі прыклад: неяк у нашым Лагойскім раёне вырашылі тры слабенькія калгасы аб'яднаць — маўляў, будзе добрая гаспадарка. Атрымалася ж на справе яшчэ горш, і мусіла раённае кіраўніцтва іх зноў раз'ядноўваць. А ў маштабах "ад Буга да Камчаткі" гэта ж будзе ўсяленская катастрофа...

Цяпер законны тэрмін вашага прэзідэнцтва заканчваецца, хоць вы і надбавілі сабе яшчэ два гады "на падставе" сумнавядомага рэферэндуму 1996 года. Скажу вам, тады многія людзі, і я ў тым ліку, галасавалі, не ведаючы за што, — як падказвала выбарчая камісія. Бо пытанні ў бюлетэнях былі, мяркую, назнарок пастаўлены заблытана, каб сходу не ўцяміць, што да чаго.

Віна за гэта і на нас, вашых выбаршчыках, што падтрымлівалі вас, не разабраўшыся. Цяпер пачынаем разбірацца. Нацешыліся ўжо вашым клопатам аб "простым народзе", хопіць. Калі ў вас хопіць рашучасці пакінуць свой пост пасля 20 ліпеня, гэта будзе чэсны ўчынак, і людзі вас зразумеюць. Прыйдуць другія, каму дарагая Беларусь і хто не паўторыць вашых памылак.

...Вось напісала, аб чым крычыць душа, і падумала: можа, нашы стогны і нашы маленні пачуе Ўсемагутны Бог?

Ніна ЗЯЛЁНКА, пенсіянерка.
в.Задор'е Лагойскага раёна.

Тема дня



Семен ШАРЕЦКИЙ, председатель Верховного Совета Республики Беларусь:

"Так кто же оказался прав?"

На интервью для "Народной воли" председатель Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва Семен Шарецкий приехал сразу со встречи с представителями Министерства иностранных дел Голландии. И сразу поделился первыми впечатлениями — мол, голландцы высказали предположение, что с помощью переговоров можно было выйти из того тупика, в каком оказалась Беларусь.

— И что же Вы им ответили?

— Рассказал о жизни. Получил на днях пенсию. Назвал им сумму. От читателей тоже нет секретов — пенсия председателя Верховного Совета за последний месяц составила три миллиона 192 тысячи рублей. Даже моя мама, которой сейчас уже 90 лет и которая, понятно, никогда не занимала высоких должностей, получила четыре миллиона. Дело в том, что президент Лукашенко своим личным распоряжением запретил индексировать мне пенсию. Как она была три миллиона, так и остается по сей день. И не у меня одного. Такая же история происходит и с экс-спикером Шушкевичем. Сейчас у меня разболелась рука, врачи прописали натирание. Моей пенсии хватает на мазь, которая расходуется за две недели. А ведь надо за что-то питаться, платить за квартиру... И я ведь не один такой. Очень многие жители Беларуси сейчас находятся в крайне затруднительном финансовом положении.

Или другой пример. Мой отец погиб на фронте, сражаясь с фашистами. А президент Лукашенко, помните, восхвалял Гитлера.

Я привел своим собеседникам и пример, связанный непосредственно с Голландией. Когда-то мы соревновались с этой страной по производству сельхозпродуктов. Теперь же в разгар пастбищного сезона пьем в основном однопроцентное молоко. Кто довел страну до такой жизни? И с этим человеком предлагают садиться за стол переговоров?!

— Семен Георгиевич, ведь такой опыт уже был. В 1997 году под эгидой европейских структур проходили переговоры представителей Верховного Совета с представителями Администрации президента.

— Да, такая попытка предпринималась. Тогда нашу делегацию возглавлял ныне покойный Геннадий Карпенко, со стороны президента вроде председательствовал тогдашний министр иностранных дел Иван Антонович. Ну и что? Ничего из этих переговоров не вышло. Причем международные эксперты однозначно определили виновника срыва этого "круглого стола" — президентскую сторону. Кстати, если помните, потом Лукашенко говорил, что Антонович вообще не обладал никакими полномочиями. Так что нам теперь снова повторять историю двухлетней давности?

— Выходит, оппозиция не пойдет на переговоры?

— Нет, почему же? Мы согласны сесть за "круглый стол", но при одном предварительном условии: президент должен выпустить из тюрем политических заключенных, дать возможность оппозиции пользоваться государственными СМИ, прекратить нарушать права человека. Если Лукашенко это сделает, то он покажет свою готовность к диалогу. Если с его стороны подобных шагов не будет, то ни к чему и забор городить. Скажем, председатель Консультативно-наблюдательной группы ОБСЕ в Минске господин Вик тоже предлагает нам сесть за стол переговоров, а этого самого господина Вика, видного международного дипломата, режим не пускает для беседы с Михаилом Чигирем. Так какие же могут быть переговоры?!

— А урок переговоров с руководителями России в ноябре 96-го?

— Уже тогда мы в душе догадывались, с кем имеем дело. Но и я, и еще три депутата, принимавшие участие в переговорах с Черномырдиным, Строевым и Селезневым, полагали, что любой мир лучше, чем война. Увы, та злопамятная ночь показала всю коварность Лукашенко. Он обманул и нас, и представителей России. Удивительно, но, похоже, что тот урок оказался бесполезным для москвичей. Они его не только поддержали во время государственного переворота 1996 года, но и сейчас, очевидно, возлагали какие-то надежды, в том числе и при решении кризиса на Балканах. С их согласия Лукашенко подключился к переговорам по Югославии. И что в итоге? Он не принес пользы ни Москве, ни Белграду, да и лично Милошевичу.

— Семен Георгиевич, а как Вы расцениваете последние заявления Лукашенко о том, что надо исправлять допущенный ранее "дикий крен на Восток" и поворачиваться лицом к Западу?

— Этим заявлением Александр Лукашенко полностью стал на сторону оппозиции. Это же мы говорили о том, что ориентиром для развития Беларуси должна быть цивилизованная Европа. Причем, и это мы все время подчеркивали, не в ущерб нашим добрым отношениям с Россией. Хочу напомнить, что я в свое время подписал документы о создании сообщества с Россией. И в этом не раскаиваюсь по сей день, ибо в тех документах было четко обозначено — развитие ЭКОНОМИЧЕСКОЙ интеграции. И в то же время было четко записано — при СОХРАНЕНИИ НЕЗАВИСИМОСТИ обоих государств. Кстати, тогда Лукашенко обвинял оппозицию и говорил, что она выступает против России, что ей чуждо все русское. Тогда, как и всегда, он попросту врал. Сейчас Лукашенко говорит, что он теперь пойдет на Запад, но он опять все подает в уродливом виде — противопоставляет Россию и Запад. Оппозиция же всегда говорила, что мы должны развивать дружественные отношения с близкими и далекими соседями. Мы хотим жить в дружбе с Россией, но вместе с тем быть в такой же дружбе и с литовцами, и с украинцами, и с поляками, и со многими другими странами.

— Семен Георгиевич, всех волнует, что будет после 20 июля, когда истечет пятилетний срок полномочий президента Лукашенко?

— Мы тоже обеспокоены тем, как может поступить этот непредсказуемый человек. Поэтому на последнем заседании Президиума Верховного Совета мы назначили на 21 июля заседание Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва. Откровенно говоря, хочется надеяться, что Лукашенко изменит свою позицию, как он это сделал по отношению к международной политике, и сам 21 июля объявит об отказе от полномочий главы государства. Именно к такому шагу мы и призывали его в обращении Верховного Совета. Может, Лукашенко наконец поймет, что удерживать власть силой невозможно.

Сессию мы наметили на 21 июля еще по одной причине. Нам надо взять то, что принадлежит по праву и закону (Конституции), — власть в стране.

— Но Лукашенко все ссылается на итоги так называемого ноябрьского, 1996 года, референдума, по которому его полномочия якобы продлены до 2001 года.

— О каком референдуме вы говорите? Его ведь не было. Под видом референдума произошел, по сути, государственный переворот. С помощью стоящих на площадях бронетранспортеров, вооруженных автоматчиков, которые блокировали здание, где находилась Центральная избирательная комиссия, и массы других неприглядных средств были созданы все условия для фальсификации итогов референдума. Все это вступало в противоречие с конституционными и законодательными нормативами. Более того, кое-кто из лукашенковцев утверждает, что Верховный Совет якобы саморассупустился. Все это грубая ложь. Достаточно сказать, что на том заседании присутствовало всего 103 депутата, а правом самороспуска парламента обладали как минимум 133 депутата. Вел то заседание Юрий Малумов, который не имел на то полномочий и вообще в тот день находился дома, так как болел. Нарушений тогда была масса, поэтому международные организации и многие страны, кроме России, несколько раз заявляли о нелегитимности того референдума.

— Семен Георгиевич, как Вы думаете, что теперь делать тем людям, которые активно поддерживали Лукашенко в его "диком крене на Восток"?

— Я тоже хотел бы спросить у бывших руководителей Беларуси Малофеева, Кебича, Камая и других: в каком же положении вы теперь оказались? Вы все время агитировали и поддерживали Лукашенко в его стремлении объединиться с Россией. А теперь выходит, что это была неправильная ориентация. Или вы поступали по отношению к Лукашенко так же, как поступали по отношению к убогому Черненко, к разрушителю СССР Горбачеву? Восхваляли и шли туда, куда вели названные "правадыры"? Правда, потом вы от этих "правадыроў" дружно отказывались. Когда же вы начнете отказываться от Лукашенко?

— Семен Георгиевич, все видят, что Лукашенко очень спешит с интеграцией. С чего бы это?

— За это время Лукашенко действительно приобрел большой опыт политической деятельности. Он прекрасно понимает, что 20 июля его легитимность заканчивается. И через союз с Россией он просто хочет продлить свои полномочия. А некоторые российские политики клюнули на эту уловку. И хотели этим же шагом продлить президентство Ельцина.

— А как Вам реакция Ельцина?

— Нормальная. Я думаю, что Лукашенко, шантажируя Кремль, ожидал каких-то резких высказываний со стороны президента России. Однако тот занял очень спокойную и невозмутимую позицию — надо развивать экономические связи. Ну кто же против этого? Понравилась мне и реакция премьера Степашина, который только высказался за улучшение отношений Беларуси с Западом. Так оно и должно быть: Беларусь и Россия встретятся в общем европейском доме, оставаясь при этом суверенными государствами.

Я думаю, что россияне, конечно же, не торопятся с подписанием предложенных Лукашенко документов по своим тактическим соображениям. Начиная с 21 июля, условия интеграции двух государств будет диктовать только одна сторона — российская. Если же Лукашенко будет вновь кипятиться, попытается протянуть свои формулировки, то из Кремля в любой момент могут спросить: а кто такой этот Лукашенко? Бывший президент Беларуси. Мы с ним никаких дел вести не хотим. И это было бы правильно. Ибо по истечении срока президентства Лукашенко его подпись на актах государственной важности будет недействительна. И я не удивлюсь, если вскоре лозунг интеграции может быть, например, таким: "За интеграцию Беларуси и России, но без Лукашенко". Одним словом, Москва, выдерживая паузу, связала Лукашенко по рукам и ногам. Отсюда и его невыдержанность, и шараханья, и прочие нелогичные поступки.

— А может, Лукашенко идет на Запад для того, чтобы там получить деньги?

— Тогда я хочу его предупредить, что, пожалуй, это тщетные попытки. Напомню, что он постоянно говорит: "Оппозиция в Беларуси финансируется Западом". Кстати, напомню, что в свое время мне тоже приписали 32 миллиона долларов, которые якобы предложили главе Верховного Совета в Америке. У меня до сих пор хранится экспертное заключение КГБ Беларуси. В нем говорится, что подметное письмо было вначале написано на русском языке, а потом переведено на английский и в таком виде было послано в мой адрес якобы из США. Без реформ никаких денег с Запада Лукашенко не получит. Как не получает их и оппозиция.

— Итак, как бы Вы сформулировали итог нашего разговора?

— Давайте попробуем уложиться в одно предложение. Когда-то Иван Сусанин из Костромы завел в болото врагов, а наш шкловский Лжедмитрий завел в тупик и покрыл позором тех, кто его вдохновлял и окружал. С каждым днем все очевиднее, что история повторяется, но на новом витке и с другим *лжеправадыром.*

Беседовал Владимир ГЛОД.

Паводле слоў старшыні Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы, у Беларусі "не адбылося ніякага прагрэсу"

На пленарным пасяджэнні Парламенцкай асамблеі АБСЕ ў Санкт-Пецярбургу выступіў старшыня Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы лорд Расел-Джонстан (Вялікабрытанія).

У сваім выступленні ён закрануў і сітуацыю ў Беларусі. Расел-Джонстан нагадаў, у прыватнасці, што пасля правядзення ў лістападзе 1996 года рэферэндуму па шэрагу пытанняў, які прайшоў з вялікай колькасцю парушэнняў, зафіксаваных рознымі арганізацыямі, 13 студзеня 1997 года было прынята рашэнне аб прыпыненні для Беларусі статусу "спецыяльна запрошанага" ў ПА Савета Еўропы. З таго часу, паводле слоў кіраўніка ПА Савета Еўропы, "у краіне не адбылося ніякага прагрэсу".

"Апошнія выбары ў мясцовыя Саветы Беларусі не даюць падстаў лічыць іх свабоднымі і справядлівымі", — заявіў Расел-Джонстан.

Уладзімір ГЛОД, БелаПАН.

Кіраўнік Цэнтрвыбаркама Расіі лічыць нерэальнай магчымасць правядзення рэферэндуму па пытанні стварэння расійска-беларускай дзяржавы да прэзідэнцкіх выбараў-2000

"У расійска-беларускага рэферэндуму, калі ён наогул адбудзецца, цяжкі лёс", — заявіў старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Расійскай Федэрацыі Аляксандр Вешнякоў.

Паводле слоў кіраўніка ЦВК, для правядзення рэферэндуму па пытанні аб стварэнні саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі спатрэбяцца велізарныя сродкі — да паўтара мільярда расійскіх рублёў. У арганізацыі ўсенароднага галасавання неабходна будзе задзейнічаць да мільёна чалавек.

Як адзначыў А.Вешнякоў, існуе шмат юрыдычных перашкод для аб'яднання дзвюх дзяржаў, "якія беларускі бок настойліва прапаноўвае ліквідаваць". На ягоную думку, істотныя зрухі ў гэтым працэсе "тэарэтычна" магчымыя ўжо гэтай восенню. "Але ў тое, што рэферэндум магчымы да прэзідэнцкіх выбараў-2000, я слаба веру. Гэта нерэальна", — лічыць кіраўнік Цэнтрвыбаркама Расіі Аляксандр Вешнякоў.

Юрый КУЗНЯЦОЎ, БелаПАН.

Ну и ну!

Александр Лукашенко дает указание профкому Белорусского металлургического завода

Президент
Республики Беларусь

Коллективу Белорусского металлургического завода

Уголовное дело, возбужденное МВД по фактам нарушения законов Республики Беларусь, находится на контроле Главы государства.

Гарантирую Вам исключительно объективное расследование уголовного дела в отношении должностных лиц БМЗ, в т.ч. Ю.В.Феоктистова.

Хочу Вас предупредить о недопустимости действий с Вашей стороны, способных дестабилизировать ситуацию на заводе. От этого можете пострадать только Вы, труженики завода. Мои принципы по борьбе с преступлениями Вы знаете и я от них отступить не могу (это также в Ваших интересах).

О ходе расследования уголовного дела Вы будете периодически информированы.

Профкому БМЗ

Довести до сведения трудового коллектива.

А.Лукашенко

30 июня 1999 г.
№ 21-08/533-8, 721-10,721-11

Недовольство крупных трудовых коллективов — серьезная опасность для любой власти. На Беларуси помнят как не так давно глава государства лично прибыл на Минский тракторный завод, чтобы погасить возмущение рабочих и не допустить многотысячного шествия, которое поколебало бы искусственно созданный имидж Беларуси как бесконфликтной страны.

Сейчас находится на грани серьезного возмущения 14-тысячный коллектив Белорусского металлургического завода. Именно этим объясняется столь грозное предупреждение президента заводчанам, текст которого приводится в сегодняшнем номере.

Данный документ появился после того как в администрацию президента поступили тысячи подписей членов коллектива БМЗ, протестующих против ареста директора Ю.Феоктистова. Александр Лукашенко предупреждает коллектив о недопустимости действий, способных дестабилизировать ситуацию на заводе. Но ведь ситуацию на БМЗ и в городе взорвала именно не совсем продуманная акция президентских спецслужб по аресту директора Ю.Феоктистова как вооруженного до зубов мафиози.

Никита ПИГУЛЬ.

Стоп-кадр



У мінулую сераду мы расказалі пра дзеянні малойчыкаў расійскага падлеткавага атрада "Беркут", якія правялі акцыю па захопе вёскі Мікалаеўка Светлагорскага раёна. Яны збівалі людзей, замянілі сцяг на будынку сельсавета, рабілі ўзрывы і дымавыя завесы прама на вуліцы.

Вось яны, гэтыя малойчыкі.

Фота IREX/ProMedia.

Аб актывізацыі "заходняга вектара" знешняй палітыкі

Першы намеснік міністра замежных спраў Беларусі Сяргей Мартынаў упэўнены ў тым, што за заявай прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі аб актывізацыі "заходняга вектару" беларускай знешняй палітыкі будуць канкрэтныя дзеянні па развіцці гэтага працэсу.

Як адзначыў С.Мартынаў, цяпер дачасна гаварыць аб канкрэтыцы мерапрыемстваў, якія пойдуць за гэтай заявай. Паводле ягоных слоў, такая канкрэтыка ўжо рыхтуецца ў МЗС краіны ў кантакце з урадам і Адміністрацыяй прэзідэнта, а таксама прапрацоўваецца і інтэнсіўна абмяркоўваецца падчас кансультацый і перамоў з прадстаўнікамі Еўрапейскага Саюза, АБСЕ і Савета Еўропы і ў двухбаковым парадку з заходнімі дзяржавамі.

"Заява адкрывае працэс, — падкрэсліў С.Мартынаў. — Вядома, гэта не адбываецца ў імгненне вока, тым больш што завалы, якія трэба разграбаць, дастаткова істотныя. Для таго, каб гэта зрабіць, патрэбны ўзаемныя і сур'ёзныя намаганні з абодвух бакоў.

Ірына САЗАНОВІЧ.

Падтрымалі здольных вучняў

Вынікі школьных экзаменаў парадавалі бацькоў многіх навучэнцаў Глыбоцкага раёна. 207 выпускнікоў з 346, закончыўшы сёлета сярэднія школы, маюць у атэстатах толькі выдатныя і добрыя адзнакі, на "выдатна" закончылі базавую школу 43 дзевяцікласнікі. Ва ўрачыстай абстаноўцы ўсім 47 "залатым" і "сярэбраным" медалістам 1999 года мясцовыя ўлады ўручылі і грашовыя прэміі адпаведна па 5 і 4 мільёны рублёў кожнаму.

Існуе на Глыбоччыне яшчэ адна добрая традыцыя. Штогод адзначаюць тут па выніках года 30 найбольш здольных і таленавітых вучняў за дасягненні не толькі ў вучобе, але і ў творчасці, спорце, розных алімпіядах і конкурсах. Зараз яна праходзіла ўжо ў трэці раз, вызначылі лепшых ў пяці намінацыях і аддзячылі прэміямі, падарункамі. Галоўны прыз — "Вучань года" — дастаўся старшакласніцы Глыбоцкай СШ №2 Святлане Гапанёнак, пачынаючай паэтэсе і прыхільніцы роднай мовы.

Уладзімір ШАЙКОЎ.

Адбылося пахаванне бацькі Генадзя Карпенкі

На 81-м годзе жыцця памёр Дзмітрый Пятровіч Карпенка — бацька былога намесніка старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання Генадзя Карпенкі. Ён перажыў свайго сына ўсяго на тры месяцы.

Раптоўная смерць Генадзя літаральна падкасіла яго бацьку, ён не змог перажыць трагедыю. Дзмітрый Пятровіч увесь час працаваў на Мінскім велазаводзе: пачынаў тут рабочым, дарос да намесніка начальніка цэха прадпрыемства. Потым працаваў у Беларускім палітэхнічным інстытуце. Гэта быў сціплы спакойны чалавек, які пасля вайны пражыў усё жыццё ў Мінску побач з прадпрыемствам, дзе працаваў.

Пахаваны Дзмітрый Пятровіч Карпенка побач з сынам.

Слышали?

О грядущем десятилетии суперкатастроф

Обнародованный новый доклад содержит предупреждение о том, что предстоящие 10 лет станут "десятилетием суперкатастроф", вызванных изменениями климата, обезлесением и перенаселением. Доклад о катастрофах в мире за 1999 г. опубликован Международной федерацией Красного Креста и Красного Полумесяца — крупнейшей в мире структурой по реагированию на чрезвычайные ситуации.

"Всем известно об экологических проблемах, связанных с глобальным потеплением и обезлесением, с одной стороны, и о социальных проблемах, вызванных усиливающейся бедностью и разрастающимися трущобами, — с другой. Но когда эти два фактора сталкиваются, мы имеем дело с новым масштабом катастроф", — утверждает президент федерации д-р Астрид Хайберг. Федерация сообщает, что за последние шесть лет число людей, нуждающихся в ее помощи, возросло более чем в 10 раз.

Прошлогодний сезон стихийных бедствий был наихудшим в истории. В 1998 г., отмечают специалисты федерации, стихийные бедствия вызвали больший поток беженцев, чем войны и конфликты. В результате урагана "Митч", который за несколько часов вылил на Центральную Америку годовую норму осадков, 10 000 человек погибло, а 2,5 млн попало в зависимость от предоставления помощи.

"Взрывоопасное сочетание антропогенных климатических изменений и быстро меняющихся социально-экономических условий породит цепную реакцию опустошений, ведущих к суперкатастрофам, — отмечается в докладе. — Миру грозит опасность, как никогда прежде".

Изменения климата "будут проявляться в виде таких бедствий, как бури, засухи и наводнения, не имеющие аналогов в современную эпоху", говорится далее в докладе. "Главная неопределенность состоит в том, где и когда они будут происходить".

Атмосферные явления "Эль Ниньо" и "Ла Нинья", которые авторы доклада нарекли "смертоносным дуэтом", вызвали по всему миру эпидемии, засухи, лесные пожары и наводнения, унесшие 21 000 человеческих жизней.

Обезлесение бассейна реки Янцзы в Китае вызвало наводнения, повлиявшие на жизнь 180 млн. человек, а в предгорьях северо-западных Гималаев аналогичный процесс вызвал в августе прошлого года оползни, в результате которых за неделю погибло более 300 человек.

Уэнди ЛЮБЕТКИН,
европейский корреспондент ЮСИА.

Пр. Давыда, Дзяніса, Івана, Ціхана. К. Веранікі, Зянона.

ЛІПЕНЬ
9
'99 ПЯТНІЦА

Усход 4.49
Захад 21.40
Даўж. дня 16.51

Апошн. квадра 6 ліпеня
Усход 3.06
Захад 18.51

Абсурд

Ох, и трудно быть буржуем

Очередь казалась небольшой. Я молча пристроился в хвосте, придал лицу отсутствующее выражение и в привычном состоянии анабиоза начал свое черепашье движение вдоль деревянной стойки: туда, к заветному окну, где две миловидные женщины неустанно трудились, перебирая ворох деловых бумаг. Прошло полчаса — очередь не сдвинулась с места.

В очереди — одни старики. Собственно, так и было задумано. Здесь собрались те, кому минуло шестьдесят пять. Родное государство вспомнило, наконец, о тех, кто ценой неимоверных усилий, подчас отказывая себе в насущных потребностях быстротекущей жизни, собрал и отдал когда-то на хранение все свои сбережения.

Наступил тот черный день, когда слившиеся в один кипящий котел великодержавные амбиции высших руководителей и простые мужские страсти взорвали, разрушили привычный мир, уничтожили жалкое благополучие и, не зная броду, повели народы к новым вершинам, не скупясь на обещания дать им рай, богатство и изобилие. Пока суд да дело, под властью новоявленных благодетелей уже давно смертельно больная экономика огромной державы окончательно развалилась. Обесценились и пропали сбережения граждан. Цены стремительно взмыли ввысь и стали просто "смешными". За пять тысяч рублей когда-то можно было купить автомобиль, теперь же — приобрести пару коробков спичек...

Вот и собрались изможденные старушки и старики, чтобы извлечь пропавшие в бумажных недрах сберегательного банка остатки былого благополучия. Именно остатки, ибо даже восстановленный, проиндексированный вклад (запоздалое благодеяние нашего правителя, о котором взахлеб, с восторгом писали официозные журналисты) даст возможность вместо автомашины приобрести разве что одно-единственное колесо.

...Начал приглядываться и соображать, почему так медленно движется очередь. Кажется, усек. Через головы стоящих у окна подаю свой паспорт, получаю две анкеты и образцы, с которыми полной ясности нет. Пришлось опять пробиваться к окошку, уточнять. Втискиваюсь опять в очередь. Вроде, скоро конец. Замечаю, что некоторые клиенты получают розовые продолговатые сшивки, вроде бы чеки.

— Что это за чеки? — спрашиваю у соседа.

— Как, вы разве не в курсе? — в свою очередь удивляется он.

И объясняет: причитающиеся по индексации деньги наличными на руки не выдают. А выдают чековую книжку, по которой в государственных магазинах можно приобретать промтовары и продукты.

Так вот оно что! При слове "чек" в мои мысли стали вплетаться знакомые ассоциации. Во всех известных мне случаях деньги по чекам получали юридические лица. Заполняли чеки опытные в своем деле кассиры. И все равно каждый раз, заполняя чек и стараясь тщательно придерживаться всех банковских требований, в чем-то ошибались. И случалось, что в банке отказывались принимать чек: то не так раскручена закорючка на подписи, то не устраивали чернила. Словом, я твердо знал, что заполнить чек — это вам не фунт изюма. Сразу же представил себя или моих соседей по очереди, трясущимися руками заполняющих чеки. На душе стало тоскливо.

Подошла моя очередь. Сдал анкеты.

—Зайдете через месяц, узнаете результат, — сказали мне на прощанье.

Месяц так месяц. Это же на сколько за этот месяц подешевеет каждый из причитающихся мне рублей! Однако мысль о том, что на старости лет я стану обладателем самой настоящей чековой книжки, грела душу и тешила самолюбие. Стал припоминать, что я еще знаю о чеках. Из нашей совковой жизни — больше ничего. А вот за границей... О загранице я знаю только из книг и кинофильмов. В этой чужой, незнакомой, увлекательной жизни чеки фигурировали очень даже часто. Сколько я их перевидел в руках самодовольных, удачливых буржуев! В нужную минуту они неуловимым движением достают из сейфа чековую книжку, небрежным росчерком пера заполняют чек и выверенным, артистическим жестом передают его деловому партнеру, облагодетельствованному просителю или очаровательной даме "на булавки".

Руки у них не трясутся при этом, да и не удивительно: они же с детства привыкают оперировать чеками. Правда, сейчас это для них вчерашний день, в моде пластиковые карточки и всякие там электронные чудеса. Что же касается нас, то и мне, и вот этим пожилым людям придется на старости лет влезать в шкуру миллионеров, приучаться к новой системе расчетов.

Конечно, наши чеки не сравнить с западными. Там их можно выписать на любое лицо, а деньги получить в любом банке. А у нас...

Прошел месяц, опять я в сберкассе. Очередь заметно поредела. Пробиваюсь к заветному окну. Подаю паспорт. Оператор простучала по клавишам, глянула на экран монитора.

— Есть, вам причитается четырнадцать миллионов девятьсот тридцать три тысячи рублей.

Опять заполняю анкеты, проверяю, уточняю. Исписывает ворох бумаг оператор. Наконец, полуторачасовая процедура окончена. Отхожу от кассы с чековой книжкой в кармане. Четырнадцать миллионов! Ого! Впрочем, все мы сегодня миллионеры.

В состоянии легкой эйфории начинаю прикидывать, как лучше использовать свалившееся на меня богатство. Вспоминаю об одном никак не решаемом деле. Все эти годы я являюсь обладателем некоторой доли имущества бывшего государства. Да, да, речь идет о них, о приватизационных чеках. В свое время пришлось выстоять с ныне уже покойной супругой те же бесконечные очереди. А как же, делился государственный пирог, и мы томились в бесконечных очередях, чтобы оторвать свою долю.

После смерти жены опять стоял в очереди на прием к нотариусу, оформил на себя ее приватизационные чеки. Долго не реализовывал их, единственное достояние, что нажито за всю безупречную жизнь. Не продал их за бесценок, когда подозрительные личности скупали чеки за углом. Потом власть переменилась, организаторов Первого приватизационного фонда назвали жуликами, активы заморозили. По крайней мере, больше никогда об этом фонде я не слышал. Правда, в газетах изредка попадаются сообщения о том, что вроде бы можно приобрести акции того или иного предприятия. Но ни одного человека, который похвастался бы, что выгодно вложил свои чеки и получает дивиденды, не встречал.

Только сейчас, ощутив в своем кармане приятную тяжесть чековой книжки, решаю поменять свои приватизационные чеки на акции. Притом немедленно. Поднимаюсь на третий этаж. Все кругом сверкает: евроремонт! Надо сказать, что здание банка — одно из немногих, возведенных у нас теперь, в тяжелое, смутное время. На двери вывеска: "Для работы с физическими лицами". Поскольку считаю себя таковым, захожу. Кругом — полированные столы, мягкие вращающиеся кресла. Мерцают экраны компьютеров. Вот нужный стол. Присаживаюсь. Молодая симпатичная сотрудница задает трудный вопрос: "Какие акции из предлагаемого списка желаете приобрести?" Пробегаю глазами список. Что толку, когда информации об этих предприятиях у меня — ноль.

— Наш местный молокозавод, — неуверенно говорю я.

Лицо ее исказилось ужасом:

— Нет, только не его!

— Ну, тогда сдаюсь, — с обезоруживающей откровенностью заявляю я, — посоветуйте что-нибудь. Как скажете, так и будет.

Собеседница задумывается.

— Вот разве Н-ский электромеханический завод, — неуверенно произносит она.

— Была не была, согласен, — произношу я, и началось оформление сделки.

Целых три бланка испортил, пока мои анкеты не удовлетворили все требования делопроизводства. Наконец, подписана последняя бумажка. Получаю квитанцию и убираюсь восвояси. Дальше дело сложилось следующим образом. Дней через десять я получил пакет. На стандартном бланке, на бумаге с защитной сеткой типографским способом было оформлено мое право на семьдесят четыре акции Н-ского электромеханического завода. Еще через пару недель — новый пакет. В нем два бланка: "Информация о деятельности открытого акционерного общества за 1-й квартал 1999 г." и "Годовой отчет за 1998 г." Там множество граф, экономических терминов, цифр. Мое внимание привлекли только две графы; в обоих отчетах в графе "Дивиденды" стоял... прочерк. Дивидендов нет, а что касается остального, это мое тщеславие удовлетворили, сообщив о кредиторской и дебиторской задолженности предприятия, активах и прочей бухгалтерской премудрости.

...А чековая книжка прожигала мой карман. В голове прокручивались тысячи вариантов. За десяток лет жизни на одну жалкую пенсию я окончательно обнищал. Живу на три "Д" — донашиваю, доедаю, доживаю. Самое большее, что могу приобрести с пенсии, это носки, носовой платок и, извините, трусы. В магазинах отоваривался "вприглядку". Подойдешь к прилавку, посмотришь на ласкающие взгляд дорогие сорта колбасы, копченую и вяленую рыбу... Да что там — простую селедку, кильку я мог себе позволить только по праздникам. Если бы у меня в кармане были нормальные деньги, можно было бы более-менее толково распорядиться ими. Наш же в любом случае истратить надо немедленно: через неделю ценность их упадет не менее чем на четверть.

Дома долго, с любовью разглядываю чековую книжку. Рассматриваю чек. Решаю заполнить [illegible] "Дубровский Семен". [illegible] Все, чек безнадежно испорчен! [illegible]

Приходит дочь. [illegible]

[illegible] магазин.

Тщетно пытаюсь остановить ее истерический визг.

— Позвольте, ведь это всего только чек, клочок бумажки, у меня их вон — целая книжка. Давайте заполним другой.

Позвали бригадира, та вызвала бухгалтера. Щупленькая старушка в очках посмотрела на чек — "Вот здесь вы проставили дату выдачи паспорта 09.02.79 г., а надо полностью, "девятого февраля..." [illegible]

[illegible] отведенную строку не уместиться. Продавщица продолжает неуверенно манипулировать ручкой, с виноватой улыбкой смотрит на меня. Опять чек безнадежно испорчен. Я беру из ее рук чековую книжку, листаю. Осталось всего три чека, ничего не поделаешь, надо заполнять новый.

Знакомая процедура. Продавщица исчезает с чековой книжкой и паспортом. Томительное ожидание. [illegible]

[illegible] когда же получу, наконец, отчет, в соответствующей графе которого после слова "дивиденды", вместо привычного прочерка, появятся увесистые, осязаемые, конкретные цифры?

И еще: сердце мое наполняется сочувствием и состраданием к владельцам чековых книжек и акций во всем мире. Как трудно быть буржуем!

Семен ДУБРОВСКИЙ.
г.Солигорск.

Да Беларусі даходзіць толькі частка германскіх кампенсацый ахвярам вайны

Беларускія ўлады не цікавяцца тым, каб да рэспублікі ў поўным аб'ёме даходзілі германскія кампенсацыі ахвярам другой сусветнай вайны. Аб гэтым у гутарцы з карэспандэнтам БелаПАН заявіў прэзідэнт Сусветнай асацыяцыі беларускіх яўрэяў (САБЯ) Якаў Гутман.

Паводле інфармацыі асацыяцыі, да Беларусі даходзіць толькі нязначная частка германскіх кампенсацый. Так, з 1995 па 1997 год да беларускіх яўрэяў не дайшло больш як 4 млн. 866 тысяч долараў ЗША з амаль 7 млн. У справаздачах Клеймс Конферэнс (Канферэнцыя па матэрыяльных прэтэнзіях яўрэяў да Германіі — афіцыйны атрымальнік германскіх кампенсацый са штаб-кватэрай у Нью-Йорку) значыцца, што гэтыя грошы былі пералічаны яўрэйскай дабрачыннай арганізацыі — мінскаму "Хэсед-Рахаміму".

"Мы зрабілі ўсё, каб прыцягнуць увагу ўрада Беларусі да гэтай праблемы, аднак дагэтуль улады аніяк не адрэагавалі на нашыя звароты", — заявіў Якаў Гутман. Ён лічыць, што сапраўднае вырашэнне праблемы кампенсацый магчыма толькі пры прамым атрыманні выплат ад ФРГ, выключаючы пасрэдніцкія арганізацыі ў ЗША і Ізраілі.

Паводле звестак Я.Гутмана, да 2030 года Германія плануе выплаціць ахвярам нацызму прыкладна 25 млрд. марак ФРГ. Мы павінны зрабіць усё для таго, каб яўрэі Беларусі атрымалі сваю частку кампенсацый, а не рэшткі ў выглядзе некалькіх пасылак у год коштам па 5—6 долараў ЗША кожная", — заявіў прэзідэнт асацыяцыі.

Марат ГАРАВЫ.

Пасольства Чэхіі пераехала ў новы будынак

У Мінску адбылося ўрачыстае адкрыццё новага будынка Пасольства Чэшскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь, размешчанага па адрасе: Музычны завулак, 1/2. Адкрыццё было прымеркавана да нацыянальнага свята Чэхіі.

Выступаючы на цырымоніі адкрыцця, першы намеснік міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Сяргей Мартынаў нагадаў, што сёння Чэхія ўваходзіць у дзесятку асноўных еўрапейскіх гандлёва-эканамічных партнёраў Беларусі. Беларусь і Чэхію звязваюць трывалыя гістарычныя і культурныя сувязі.

Са свайго боку Часовы паверааны ў справах Чэхіі ў Беларусі Алеш Фойцік пацвердзіў, што Пасольства Чэхіі мае намер актыўна працаваць па развіцці і ўмацаванні доўгатэрміновага супрацоўніцтва сваёй краіны з Беларуссю.

Ірына САЗАНОВІЧ.

Нацыянальны банк зацікавіўся кліентамі, якія скупляюць шкляную тару

Нацыянальны банк Беларусі звярнуўся да банкаў рэспублікі з просьбай да 15 ліпеня гэтага года прадаставіць інфармацыю аб кліентах, якія займаюцца скупкай шкляной тары ў насельніцтва. Такая інфармацыя павінна ўтрымліваць звесткі аб форме ўласнасці кліентаў, якія купляюць шклотару; кім і калі ім выдадзеныя рэгістрацыйныя дакументы; звесткі аб прадпрыемстве, з якім заключана дамова на пастаўку шклотары.

Гэтая просьба выказана ў адпаведнасці з даручэннямі прэзідэнта, аддадзенымі на нядаўняй нарадзе па пытаннях цэнаўтварэння. Нагадаем, што на той нарадзе размова ішла аб жорсткім кантролі за абаротам наяўных грашовых сродкаў для распрацоўкі нарматыўных актаў, якія будуць рэгуляваць пытанні забеспячэння разлікаў прадпрыемстваў і прадпрымальнікаў з насельніцтвам за здадзеную шкляную тару.

Ягор ЗВОННІКАЎ.

На працягу трох дзён дэпутаты зямлі Ніжняя Саксонія (Германія) вывучалі сітуацыю ў Беларусі

Інфармацыю аб сітуацыі ў трэцім сектары Беларусі атрымалі члены парламенцкай дэлегацыі зямлі Ніжняя Саксонія (ФРГ) падчас сустрэчы з прадстаўнікамі няўрадавых арганізацый. Размова працягвалася каля чатырох гадзін і праходзіла згодна з праграмай візіту ў Мінск нямецкай дэлегацыі. Арганізатарамі візіту з беларускага боку выступілі фонд "Дзецям Чарнобыля", з нямецкага — арганізацыя НІКО-Бела, якая з'яўляецца дабрачынным незалежным саюзам. Трохдзённая паездка нямецкіх парламентарыяў праходзіла пад патранажам міністэрстваў замежных спраў дзвюх дзяржаў.

У Мінску, дэпутатаў зямельнага Ландстага прыняў кіраўнік Кансультацыйна-назіральнай групы АБСЕ ў Беларусі Ханс-Георг Вік.

Уладзімір ГЛОД, БелаПАН.

Аднаўленню не належыць

Нават ветэраны Пастаўскай аварыйна-выратавальнай часці не памятаюць такой напружанай пажаранебяспечнай абстаноўкі. Пасля вымушанага ўвядзення на Віцебшчыне забароны на наведванне лясоў адбыліся ў гэтай мясцовасці чатыры лясныя пажары, гарэлі тарфянікі. На плошчы тры з паловай гектары згарэў лес у Груздаўскім лясніцтве, а ў дні міжнароднага фестывалю народнай музыкі паблізу райцэнтра агнём было знішчана больш гектара маладых лесапасадак. На гэтай і на дзвюх іншых пацярпеўшых тэрыторыях малады лес, на жаль, аднавіць не ўдасца. У лепшым выпадку застаецца пусціць яго на дровы. Тым часам у вобласці толькі за апошні чэрвеньскі тыдзень адбылося 20 пажараў, страты ад якіх склалі 1134 мільёны рублёў. Нарэшце, самае страшнае, што ў полымі бязлітаснага агню на Віцебшчыне загінула ўжо 85 чалавек.

Уладзімір ШЫК.

На думку Нацыянальнага выканаўчага камітэта, сёлета Беларусь не дабярэ больш як трэцюю частку запланаванага збору збожжавых

Сёлета наша краіна не дабярэ больш як трэцюю частку запланаванага збору збожжавых — такі несуцяшальны прагноз быў зроблены на пасяджэнні Нацыянальнага выканаўчага камітэта (НВК) — "ценявога" -рада. Як вядома, прэзідэнт А.Лукашэнка паставіў перад аграрным комплексам задачу ў 1999 годзе атрымаць не менш як 6 млн.тон зерневых. Паводле прагнозаў НВК, якія рыхтавала група спецыялістаў на чале з членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Іванам Нікітчанкам, збор збожжавых не перавысіць 3,6 млн.тон.

Такім чынам, зерне прыйдзецца закупляць за мяжой. Прычым нават 6 млн. тон не хопіць для патрэб краіны і таму, як лічыць І.Нікітчанка, прыйдзецца закупляць за мяжой каля 3,5 млн. тон зерня. У адваротным выпадку будзе разбурана ўся прамысловая жывёлагадоўля (свінагадоўля і птушкагадоўля).

На пасяджэнні таксама былі зацверджаны мерапрыемствы па падрыхтоўцы Праграмы нацыянальнага развіцця Беларусі. У ліпені—верасні будзе завершана фарміраванне даследчай групы, падрыхтаваны і апублікаваны папярэднія аналітычныя матэрыялы. На верасень намечана правядзенне рабочага семінара экспертаў, а на лістапад — буйной канферэнцыі.

Уладзімір КОТ, БелаПАН.

Зноў знік камбікорм

Вось ужо паўгода нават у гандлёвых кропках Глыбоцкага камбікормавага завода стала немагчыма купіць кармоў для вырошчвання дамашніх жывёлін. Праўда, у пачатку года неяк выкінулі ў продаж 30 тон камбікорма, якія людзі размялі за некалькі гадзін. Без гэтага каштоўнага корму цяжка выгадаваць ладную свінку, слаба прыбаўляе ў вазе бычок, ды і куры радзей радуюць свежым яйкам. Яшчэ летась, да прыкладу, у Міёрскім раёне, дзе таксама працуе свой камбікормавы завод, насельніцтву прадалі яго 2500 тон. Зерня ў Беларусі, аднак, не прыбаўляецца, вось і ўзніклі праблемы, як за савецкім часам. Раней хоць жывёлу карміл танным хлебам, зараз жа паўсюдна на продаж мукі, крупы ўведзены абмежаванні. Простым людзям застаецца толькі чакаць уласнага ўраджаю збожжа і перастаць верыць у байкі аб нейкай харчовай бяспецы краіны.

Уладзімір ШЫМОЎСКІ.

У Крыме прайшлі Дні культуры Рэспублікі Беларусь

У Крыме завяршыліся Дні культуры Рэспублікі Беларусь, якія на працягу пяці дзён праходзілі ў гэтай аўтаномнай рэспубліцы Украіны.

Як паведамілі БелаПАН у прэс-службе МЗС Беларусі, у Крымскім музычным тэатры ў Сімферопалі ў дзень адкрыцця Дзён быў паказаны спектакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы "Ідылія". У кінатэатры "Сатурн" прайшлі Дні беларускага кіно.

Дзяржаўны ансамбль песні "Свята" выступіў з канцэртам у горадзе Сакі. У Ялце беларусы ўсклалі кветкі на магілу Максіма Багдановіча. У санаторыі "Лівадзія" пад Ялтай адбылася творчая сустрэча з рэжысёрска-пастановачнай групай кінастудыі "Беларусьфільм", а таксама прайшлі прэм'ерныя паказы беларускіх фільмаў.

Андрэй АСМАЛОЎСКІ.

Прыватны натарыус з Гомеля просіць А.Лукашэнку...

Прыватны натарыус з Гомеля Людміла Васільева накіравала прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку ліст з просьбай звярнуцца ў Канстытуцыйны суд (КС) на прадмет адпаведнасці Канстытуцыі прэзідэнцкага ўказа N289 ад 27 мая 1998 года "Аб некаторых пытаннях вяртання ў даход дзяржавы неабгрунтавана набытай дзяржпошліны".

Менавіта гэты дакумент распачаў кампанію па прад'яўленні прыватным натарыусам фінансавых прэтэнзій заднім чыслом, тады як у Канстытуцыі краіны гаворыцца аб недапушчальнасці падобных дзеянняў.

Сваю просьбу да прэзідэнта Л. Васільева матывавала тым, што суды ўсіх інстанцый адмовілі ёй у прыняцці хадайніцтва аб узбуджэнні падобнага слухання ў КС. Адвакат лічыць, што прычынай таму з'яўляецца хваляванне суддзяў за ўласны лёс, паколькі кампанія супраць прыватных натарыусаў мае палітычны падтэкст. "Пры падобных абставінах прэзідэнт А. Лукашэнка — адзіная асоба, якая можа не баяцца звароту ў КС. І, як гарант Канстытуцыі, ён не мае права адмовіць мне ў такой просьбе, бо інакш парушаюцца мае канстытуцыйныя правы і свабоды грамадзяніна", — заявіла Людміла Васільева ў гутарцы з карэспандэнтам БелаПАН.

Ірына МАКАВЕЦКАЯ.

Магілёў наведаў каардынатар праграм агенцтва ЗША па міжнародным развіцці Роберт Сімпсан

На працягу трох дзён ён сустрэўся з кіраўніцтвам горада, пазнаёміўся з развіццём малога і сярэдняга бізнесу, наведаў анкалагічны дыспансер, інавацыйны цэнтр "Тэхнапарк Магілёў", браў удзел у сустрэчах з прадстаўнікамі рэгіянальных грамадскіх арганізацый, недзяржаўнай прэсы і незалежных прафсаюзаў.

Р.Сімпсан адзначыў, што збіраецца даведацца аб працы грамадскіх арганізацыі і прыватнага сектару эканомікі ў Магілёве. "Мы хацелі б наладзіць сувязі паміж амерыканскімі і беларускімі арганізацыямі ва ўсіх сферах дзейнасці, у тым ліку ў медыцыне", — заявіў у інтэрв'ю карэспандэнту БелаПАН Роберт Сімпсан.

Між тым, як стала вядома, на сустрэчы са старшынёй Магілёўскага гарвыканкама Міхасём Красновым аб магчымай фінансавай падтрымцы якой-небудзь з сацыяльных праграм гаворкі не было.

Канстанцін УВАРАЎ.

Кватэра, у якой вёўся гандаль наркотыкамі

За апошнія дні ў розных раёнах Магілёўскай вобласці супрацоўнікамі міліцыі вынайдзены і канфіскаваны наркатычныя рэчывы, а таксама выяўлены буйны гандлёвы пункт бабруйскіх наркаманаў.

Так, 350 грамаў высушанай макавай саломкі было знойдзена на кватэры непрацуючага дзевятнаццацігадовага жыхара горада Быхава; 10 кг гэтага ж рэчыва былі канфіскаваны ў вёсцы Стан Горацкага раёна ў хаце непрацуючага трыццацігадовага мужчыны. Пры правядзенні спецыяльных мерапрыемстваў супрацоўнікам праваахоўных органаў у ваенным гарадку Бабруйск-25 удалося канфіскаваць літр экстракцыйнага опію, які належаў дваццацігадоваму мясцоваму жыхару.

У самім Бабруйску міліцыянеры здолелі знайсці кватэру, у якой вёўся гандаль наркатычнымі рэчывамі. Толькі на працягу некалькіх гадзін гэты прытон наведалі больш за 20 чалавек — усе яны затрыманы. Паводле папярэдніх звестак, наркотыкі ішлі ў Бабруйск са Жлобіна (Гомельская вобласць). У выпадку доказу віны гаспадару кватэры пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да 10 гадоў.

Канстанцін УВАРАЎ.

Слово ветерана

Не нужны нам "неоплатные долги"...

Согласитесь: жизнь заставляет переоценивать прежние, казалось бы, незыблемые ценности. Вот слово "Родина", перед которым мы благоговели. Отдавали за нее самое дорогое — жизнь и здоровье. А сколько недодала она нам, не возвратила, предала забвению... Она сама оказалась в долгу не только перед ветеранами войны, но и перед нашими детьми и внуками. В свое время мы искренне клялись в любви к Родине. Но сейчас о какой любви может идти речь? Что любить: нищету и бедность, сосновые боры или березовые рощи что ли? Загаженные реки и озера, кислотные дожди, чернобыльскую радиацию, отработанные газы автомобиля? Или — очереди, очереди без конца за всем необходимым. Только это нам и оставлено.

...Когда ветераны второй мировой — граждане США — возвратились домой с войны, то каждый получил чек на десять тысяч долларов. За них в то время можно было купить десять классных машин.

Я недавно встречался с польским ветераном войны. И когда ему рассказал, как живу, и показал, что у меня не работают телевизор и холодильник (а починить — кошелек слабоват), то он удивился и высказал очень нелестные слова в адрес наших государственных чиновников.

Являясь инвалидом второй группы Великой Отечественной войны, я до сих пор ни разу не получил инвалидскую машину. Более того, вскоре после войны у нас отобрали доплату и льготы за боевые награды. А сегодня нам часто приходится выслушивать от юнцов нечто вроде: "Да скоро ли вы, наконец, перестанете болтаться у нас под ногами?". И это — будущее Родины? Можно ли на склоне лет любить такую Родину?

А давайте вспомним праздничные выступления чиновников перед ветеранами. Все они начинают и кончают свои речи так, что, дескать, "мы перед Вами, дорогие, в вечном, неоплатном долгу". А нам вечные долги не нужны! Ветераны уходят в мир иной один за одним. И хотя оценить в каком-то материальном выражении нашу пролитую кровь, полученные в боях ранн, утерянное здоровье невозможно, но, полагаю, во всяком случае ветеран войны имеет право иметь хорошее жилье, получать приличную пенсию, иметь транспорт и ряд других благ.

Это имело бы и большое воспитательное, патриотическое значение. Ведь сегодня, глядя на наше нищенское существование, вряд ли современная молодежь с таким рвением и пафосом бросится в бой, если этого потребует обстановка, как бросались мы. Да, она добровольно готова ехать за тысячу верст и за тысячу долларов в месяц — скажем, в Югославию. Мы же воевали за свою Родину, не жалея себя и ничего тогда не ожидая взамен. И — ничего не получили... Тогда думали — жила бы страна родная, а теперь считаю, хоть напоследок и самим пожить надо. Так что за страной, за ее путеводителями еще числятся солидные долги ветеранам второй мировой.

К.ПЛИГАВКА,
ветеран войны, заслуженный работник культуры Республики Беларусь.
г.Докшицы.

Вандалізм

Пакутніцкая зямля, пакутніцкі крыж...

Усяго ў некалькіх кроках ад сталічнага мікрараёна Зялёны Луг-6 — толькі перайсці кальцавую дарогу — ляжыць гэтая зямля. Набрынялая крывёю нявінных ахвяр, усеяная шматлікімі ямінамі-правaламі на месцах магіл, нагадваючых пустыя вачніцы.

Курапаты... Наш несціханы боль, пякучая, нязгасная памяць аб трагічных падзеях, што адбываліся тут на працягу 1937—1941 гадоў, у часы сталінскіх рэпрэсій. Дзень і ноч працавала тут бязлітасная машына смерці: штодня прывозілі сюды на машынах дзесяткі вязняў са звязанымі рукамі, ставілі на край свежавыкапаных вялікіх ям — і стралялі, запаўняючы магілы чалавечымі целамі, пакладзенымі ў некалькі радоў, бы дровы...

Перадсмяротныя крыкі і стогны пакутнікаў, трэск несціханых стрэлаў некалькі год запар чулі жыхары навакольных вёсак, працуючы на калгасным полі ці збіраючы ў лесе ягады. Многія сведкі тых жудасных падзей жывыя і зараз. Яны распавядаюць пра тое, чаго нельга забыць і нельга дараваць — аб злачынствах бесчалавечнай сістэмы супраць сваіх грамадзян. Злачынствах, якім няма тэрміну даўнасці і якіх не выкрэсліць з пакутніцкай гісторыі нашай Бацькаўшчыны.





Больш за дзесяць год таму праўда аб Курапатах выбухнула і ўскалыхнула Беларусь і ўвесь свет. Сярод ляснога гушчару ўзняўся высокі крыж у памяць усіх, хто загінуў ад рук бязлітасных катаў: слынных паэтах і простых сялянах, людзях розных вераванняў, нацыянальнасцей і ўзростаў, паяднаных страшным лёсам у гэтых брацкіх магілах. А непадалёк ад крыжа, на пагорку, быў пастаўлены камень з пастановай-абяцаннем тагачаснага беларускага ўрада ўзвесці на гэтым месцы мемарыял.

Мемарыяла няма і па сённяшні дзень. Але Курапаты, вядомыя цяпер усёй планеце, сталі месцам народнага паломніцтва. У святы і будні людзі прыходзяць сюды з кветкамі, запальваюць свечкі, кланяюцца тым, хто тут ляжыць і чый прах стаў зямлёй, травой, белымі пяшчотнымі пялёсткамі. Прыходзяць памаліцца, падумаць. Слухаюць трывожны пошум дрэў, у якім чуюцца галасы жальбы і праклёну.

Сюды прыходзяць дзеля таго, каб памяць і праўда аб некалі перажытых народам выпрабаваннях былі вечнай перасцярогай жывым: "Не дапусціце вяртання жахлівых прывідаў мінулага!"

Але самі "прывіды" ў мінулае канчаткова яшчэ не сышлі. Праўда для іх смерці падобна, і яны ваююць з ёю зацята і ўпарта. Розныя "камісіі" працягваюць раскоп магіл, не даючы спакою касцям шматпакутных ахвяр. Усё намагаюцца даказаць: маўляў, "не тых" расстрэльвалі і "не тыя"... Сюды наведваюцца банды марадзёраў, не спыняючыся перад прамым дзікунствам і кашчунствам: шукаюць сярод сатлелых парэшткаў міфічнае "золата", раскідваюць чалавечыя косці па лесе. Тут можна ўбачыць цёпленькую "шашлычную" кампанію, утульна ўладкаваную побач з кустоўем, пад якім бялее чэрап з дзіркай на патыліцы... Тут выгульваюць сабак і выпіваюць-закусваюць "інтэлектуалы" з шыза-чырвонымі насамі, пакідаючы паўсюль смецце і іншыя знакі "высокай культуры".

Гнюсныя акты вандалізму ў Курапатах з цягам часу пачашчаюцца. Ужо не раз нечыя брудныя рукі завальвалі шыльду-ўказальнік аб тым, што тут — месца масавых расстрэлаў у часы сталінскіх рэпрэсій; адлітыя з металу словы нехта раскідаў па гушчары. Не раз зразаліся павязаныя на крыжы вышытыя ручнікі, тапталіся кветкі вакол яго, падпілоўваўся сам крыж. А нядаўна ад металічнай пліты з надпісам "Пакутнікам Беларусі" ля яго падножжа (гл. здымкі) адбілі ладны кавалак — усю верхнюю частку. Некаму даялося пастарацца...

"Некаму", "нехта"... На жаль, курапатаўскія злачынцы, для якіх няма нічога святога, так ні разу і не былі выяўлены, тым больш — прыцягнуты да адказнасці. Тэрыторыя ўрочышча з масавымі пахаваннямі нашых суграмадзян, што ўваходзіць у склад Ждановіцкага лясніцтва, да гэтай пары не агароджана і фактычна не ахоўваецца. "Скажуць сачыць за парадкам — будзем сачыць, а пакуль такіх распараджэнняў не паступала", — патлумачыў малады міліцэйскі сяржант, сустрэты аднойчы (рэдкая за шмат гадоў сустрэча!) у Курапатах.

Сённяшнія ўлады, ад якіх залежыць і ўзвядзенне помніка ахвярам таталітарызму, і арганізацыя аховы святой мясціны, чамусьці не надта імкнуцца засведчыць рашучае развітанне са змрочным мінулым. Няўжо лічаць вандалізм нармальнай, не вартай увагі з'явай на парозе XXI стагоддзя ў самым цэнтры Еўропы?

Трывожныя пытанні не даюць спакою на гэтай пакутніцкай зямлі. Але ясна адно: праўду аб Курапатах ужо нікому не закапаць. Яна не дае заснуць нашаму сумленню, нашай адказнасці за будучае роднай Бацькаўшчыны.

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.
Фота Уладзіміра КАРМІЛКІНА.

Народная Воля 9 ЛІПЕНЯ 1999 г.

Дворцовые тайны

КАК ФИДЕЛЬ С ГОРБАЧЕВЫМ ПОССОРИЛИСЬ

Бывший начальник штаба Службы правительственной охраны во времена Михаила Горбачева генерал-майор запаса Валерий ВЕЛИЧКО заканчивает книгу своих воспоминаний с рабочим названием "Кремлевская стража". Фрагмент из нее, связанный с неизвестными широкой публике нюансами визита М.С.Горбачева на Кубу в 1989 году, автор предложил для публикации газете "Труд".



Еще в Москве, в преддверии визита изучая материалы, касающиеся Кубы, я обратил внимание на фотографии симпатичного мулата, неотступно сопровождавшего Фиделя. Это был Хосе Абрантес Фернандес. Прежде он работал личным шофером, затем телохранителем Фиделя, возглавлял его личную охрану. Именно с ним мне пришлось детально обсуждать возникавшие вопросы при подготовке визита Горбачева.

Проблема, которую нам с Абрантесом пришлось решать при подготовке визита, была не из простых. Господин Горбачев по прибытии в аэропорт Хосе Марти собирался сесть в свою машину, привезенную на Кубу с собой. Однако Фидель настаивал, чтобы он сел в его машину и вместе с Фиделем проследовал в столицу. Мотивировалось это соображениями безопасности. Но подобное поведение было бы абсолютно беспрецедентным в практике международных отношений. Хосе Фернандес резонно заметил, что вряд ли такая ситуация могла бы сложиться, например, при визите Рейгана в Москву. Он подчеркнул, что кубинцы не могут пойти на это и просят нас учесть их национальную гордость. Я понимал абсурдность требований нашей стороны, но центр настаивал именно на этой схеме.

Фидель же, в свою очередь, хотел, чтобы Горбачев не просто ехал в его машине, но машина, по его мнению, должна была быть открытой. Ведь в честь приезда высокого гостя кубинский комитет по труду собрал рабочий день. Приветствовать советского лидера должны были выйти более полумиллиона гаванцев. Было бы просто неуважением к ним, если бы мимо на высокой скорости промчались лимузины с затемненными бронированными стеклами. Несмотря на эту непростую ситуацию, в ходе нашего общения мы с Хосе Абрантесом проникались все большим уважением друг к другу.

Вообще кубинская служба безопасности заслуживала самой высокой оценки. Ведь ею, по словам Абрантеса, было предотвращено около 40 покушений на Фиделя Кастро.

Дело в том, что в его гибели были заинтересованы не только американские спецслужбы, но и мафия, до революции превратившая Кубу в самое злачное место Латинской Америки. И все эти покушения были успешно предотвращены кубинскими спецслужбами.

Надо сказать, что служба безопасности была великолепно вооружена и оснащена. Продвижение по службе обусловливалось отношением к повышению образовательного уровня, совершенствованием в физической и специальной подготовке. Поэтому в личную охрану Фиделя зачислялись только суперпрофессионалы, как правило, знавшие 2—3 языка люди. У них была великолепная школа рукопашников.

Девятое управление КГБ, кстати, своих бойцов посылало учиться на Кубу. Для стран третьего мира там готовили боевых пловцов, воздушных десантников и бойцов групп специального назначения. Да и сами кубинцы прекрасно проявили себя во многих освободительных войнах.

Помню начальника управления персональной охраны генерала Умберто Франсиса Пардо. Двухметровый чернокожий гигант. Ветеран спецвойск. Воевал в Эфиопии, Мозамбике, Анголе. Когда американцы высадились на Гренаде, он улетал с последним самолетом, буквально отстреливаясь от американских джипов, догонявших его по взлетной полосе.

Один из заместителей министра внутренних дел, десантник, даже с протезом вместо ноги продолжал прыгать с парашютом. Это были отнюдь не чиновники, а настоящие бойцы.

В конце концов проблема с автомобилем была решена, причем на самом высоком уровне. Горбачев, видимо, в расчете на то, что Фидель уступит, предоставил ему право выбора. Но Фидель настоял на своем. Горбачев должен был прилететь на Кубу из Нью-Йорка, а затем лететь в Лондон.

У нас все было готово к визиту высокого гостя. Его ожидали 8 декабря 1988 года. Вечером 7-го в коттедже на берегу моря, где нас поселили кубинские товарищи, как это было заведено в период подготовки визита, шло совещание представителей советской и кубинской охраны. Около 23 часов раздался звонок по телефону правительственной связи. Звонил начальник Девятого управления Юрий Сергеевич Плеханов. Он поинтересовался, есть ли у меня возможность переговорить с ним минут через 5—10 по закрытой связи. Через несколько минут я услышал голос генерала. Он спросил, сколько у нас самолетов. Услышав, что в гаванском аэропорту находятся один ИЛ-86М, предназначенный для Горбачева, и 3 грузовых самолета, он отдал приказ: "Через час ИЛ должен вылететь в Нью-Йорк, а до десяти утра на Кубе не должно остаться никого из членов нашей группы.

Я был потрясен. Конечно, возникли самые разные опасения. Уже идя с пункта связи, я столкнулся с возбужденным корреспондентом АПН, который и рассказал мне, что произошла трагедия в Спитаке — землетрясение.

Через час вылетел основной самолет.

А через некоторое время мне сообщили, что Фидель хочет первым оказать помощь жителям Спитака, отправив на нашем самолете плазму крови. Но на этом самолете должны были лететь бронеавтомобили, которые, как я уже знал, направлялись в Спитак для Рыжкова. Вот такая дилемма: или плазма, необходимая для умирающих, или автомобили. Мне удалось сделать так, что в самолеты погрузили и то, и другое. На аэродроме нас провожал Фидель. Погрузку ящиков с плазмой снимали ведущие телекомпании мира. Конечно, ящики были погружены без соблюдения необходимых требований. Снова пришлось делать выбор.

Я пошел на риск: сотрудники кубинской охраны держали ящики. Летчики говорили потом, что это был самый опасный полет в их практике. Но мы все же взлетели и благополучно долетели.

Визит Горбачева состоялся на следующий год, в апреле 1989-го. Прекрасные отношения, сложившиеся с представителями кубинских спецслужб в прежнее посещение, помогли на этот раз быстро решить все вопросы, связанные с подготовкой визита. Полмиллиона кубинцев с искренней радостью приветствовали советского и кубинского лидеров, ехавших в открытом автомобиле по улицам Гаваны. Море цветов, флаги — это, конечно, был настоящий праздник.

Однако при огромной доброжелательности кубинцев, горячо встретивших советскую делегацию, отношения между двумя лидерами не сложились. Увлеченный многочисленными социалистическими инициативами, по-латиноамерикански горячий Фидель стремился показать Горбачеву новые школы и стадионы, больницы, научно-исследовательский центр. Приводил статистические данные повышения грамотности и снижения детской смертности после революции. Надо сказать, что сам Фидель в разное время увлекался биотехнологией, семейной медициной, изучал практику строительных микробригад. Он разбирался во многих технологических тонкостях, по существу, профессионально.

Горбачев был на редкость невесел и молчалив. Периодически он пытался затеять разговор о нецелесообразности поддержки кубинцами сандинистов в Никарагуа и сальвадорских повстанцев. Тогда мы еще не знали, что 27 марта, за несколько дней до визита на Кубу, Горбачев получил секретное письмо от президента Буша, в котором прямо и недвусмысленно было заявлено: "Инициатива Советского Союза и Кубы по прекращению помощи... окупится серьезными дивидендами доброй воли Соединенных Штатов".

Не получался у Михаила Сергеевича и привычный для контактов с лидерами стран Восточной Европы менторский тон. На просьбу Фиделя надавить на янки, чтобы те закрыли антикубинскую станцию "ТВ Марти", которая со дня на день должна была начать передачи из Флориды, Горбачев пытался отшутиться в свойственной ему "философской" манере. Кастро в ответ заявил, что не собирается обсуждать туманные принципы, ему надо просто "заткнуть глотку "ТВ Марти".

Фидель стал все чаще задавать неприятные для Горбачева вопросы о ходе перестройки, начавшейся безработице, росте преступности в СССР. Фидель тоже начинал свою кубинскую перестройку. Она, правда, больше напоминала программу действий Юрия Андропова, предусматривающую наведение порядка в стране жесткой рукой.

Показательно, что при встрече Фидель и Горбачев обнялись, прощаясь же, холодно пожали друг другу руки. Провожали Горбачева не полмиллиона, а лишь около 150 тысяч кубинцев.

Валерий ВЕЛИЧКО.

Вознаграждения за информацию о военных преступниках

(Государственный секретарь Олбрайт предлагает вознаграждение до 5 млн. долларов)

Представитель Госдепартамента заявил о том, что Государственный секретарь Олбрайт объявила о начале программы вознаграждений за информацию о военных преступниках.

Соединенные Штаты предлагают вознаграждение в размере до 5 млн. долларов за информацию, результатом которой может стать арест или осуждение в судебном порядке на территории любой страны лиц, обвиненных Международным уголовным трибуналом для бывшей Югославии (МУТЮ) в серьезных нарушениях международного гуманитарного права, или за информацию, результатом которой может стать передача этих лиц в МУТЮ или их осуждение этим органом.

Любой человек, располагающий информацией, в частности, о местонахождении любого из обвиняемых на территории любой страны, должен немедленно связаться с ближайшим посольством США.

Можно также пользоваться телефоном: 1-800-HEROES1.

Можно установить контакт с веб-сайтом программы вознаграждений Госдепартамента США в Интернете по адресу: WWW.HEROES.NET.

Вся информация и данные об обвиняемых, предоставленные правительству США, будут приняты в обстановке строгой конфиденциальности. Официальные представители правительства США и правительств других стран, которые в ходе исполнения ими своих служебных обязанностей представят соответствующую информацию об обвиняемых, могут также рассчитывать на вознаграждение в рамках этой программы.

Клад побач са смерцю

Сёлета ўжо двойчы на палетках калгаса "Маладая гвардыя" Міёрскага раёна ў зямлі адшукваліся супрацьлеглыя знаходкі. Не кожнаму ў жыцці выпадае знайсці клад, як гэта пашчасціла механізатару М.Арлоўскаму. Два гаршкі са старажытнымі манетамі, на якія натрапіў ён за вёскай Дварчаны, спецыялісты аднеслі да перыяду XVI—XVII стагоддзяў. Большасць тагачасных грошай — талераў, салідаў — добра захавалася, паколькі былі зробленыя са срэбра. 75 манет перадаў трактарыст у музей, які стварае на сваёй малой радзіме — у вёсцы Лявонполле — вядомы беларускі пісьменнік Сяргей Панізнік, адзначыўшы нядаўна 40-годдзе творчай дзейнасці. Крыху пазней у гэтых мясцінах другі вясковец убачыў у глебе неразарваны артылерыйскі снарад і супрацьпяхотную міну. Выкліканыя ім сапёры абясшкодзілі смяртэльную знаходку, узарваўшы яе побач з полем.

Васіль ШАХНАВЕЦ.

Беларуская дзелавая місія ў Марока

Група прадстаўнікоў дзелавых і банкаўскіх колаў Беларусі прыбыла ў Касабланку (Каралеўства Марока). Гэта першая ў гісторыі Беларусі дзелавая місія ў Марока была арганізавана Беларускай гандлёва-прамысловай палатай (БелГПП). Яе мэта — усталяванне кантактаў паміж беларускімі і мараканскімі прадпрыемствамі, абмеркаванне канкрэтных праектаў супрацоўніцтва і магчымасці стварэння сумесных вытворчасцяў.

Падчас візіту, які працягнецца да 14 ліпеня, прадстаўнікі Беларусі праінфармуюць мараканскіх бізнесменаў з эканамічнай сітуацыяй у краіне, асновамі заканадаўства ў сферы знешнеэканамічнай дзейнасці, магчымасцямі арганізацыі сумеснага бізнесу.

Ірына САЗАНОВІЧ.

Археолагі працягваюць даследаванне неалітычных паселішчаў ля вёскі Моталь Іванаўскага раёна

Археолагі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі працягваюць вывучаць неалітычныя паселішчы ля вёскі Моталь Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Задачай цяперашняй экспедыцыі з'яўляецца даследаванне пытанняў старажытнага клімату і праблем узаемаадносінаў плямёнаў каменнага стагоддзя з навакольным асяроддзем.

Археалагічныя экспедыцыі ў складзе студэнтаў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта пад кіраўніцтвам доктара гістарычных і кандыдата геаграфічных навук Алены Калечыц, якая даследуе пытанні палеагеаграфіі і экалогіі плямёнаў каменнага веку, не першы год прыязджаюць у вёску на беразе Ясельды. Тут знаходзяцца чатыры паселішчы гэтак званай "нёманскай культуры" — археалагічнай культуры неалітычных плямёнаў, якія жылі ў 4—3 тысячагоддзях да нашай эры на тэрыторыі беларускага Панёмання, левабярэжжа верхняй Прыпяці, паўночным усходзе Польшчы і паўднёвым захадзе Літвы.

Яшчэ ў 1962 годзе пры раскопках ля вёскі Моталь было знойдзена каля 200 крамянёвых прыладаў працы, у тым ліку разцы, праколкі, скрабкі, грубаабітныя цяслы і сякеры, рэшткі глінянага посуду. У наступных экспедыцыях археолагі дасталі з зямлі каля 15 тысяч прадметаў "нёманскай культуры".

Марат ГАРАВЫ.

Удзячнасць амерыканскага кангрэсмена

Член Кангрэса ЗША Сэм Гейдэльсон у суправаджэнні супрацоўнікаў амерыканскага пасольства ў Беларусі нядаўна наведаў з прыватным візітам Докшыцкі раён. На Віцебшчыну высокі госць прыбыў па просьбе свайго пажылага бацькі, які ў гады вайны жыў у мястэчку Парафьянава і цудам выратаваўся ў час масавага знішчэння мясцовых яўрэяў. Бацьку Сэма спачатку прыхавала, нягледзячы на смяртэльную небяспеку, сям'я Ядвігі Далшук з вёскі Целяшы, а потым хавала ўцекача ад карнікаў другая беларуска — Браніслава Карсун з Янавічаў.

Абедзве жанчыны, на шчасце, жывыя і былі вельмі расчуленыя сустрэчай з амерыканцам. Пасля прыёма ў райвыканкаме С.Гейдэльсон наведаў тэрыторыю былога фашысцкага гета, дзе ўсклаў вянок ад Кангрэса ЗША ахвярам рэпрэсій, на зваротным шляху аддаў знак павагі загінуўшым у Хатыні.

Уладзімір РАМАНЧУК.

Здарэнні

Тры пажары за адну ноч

Здарыліся яны ўсе ў адзін час — за паўноч, пры ясным зорным небе. У калгасе імя Леніна пажар узнік у закрытым з усіх бакоў сенаскладзе, дзе захоўвалася 120 тон зацюкаванага корму. Прыбыўшым з горада і калгасным пажарнікам удалося з цяжкасцю збіць полымя і частку сена ўратаваць. Версія ўзгарання ва ўсіх службоўцаў адна — наўмысны падпал.

У тую ж ноч невядомыя злачынцы, узламаўшы замок у гаражы саўгаса "Танежыцы" паблізу канторы, вырашылі запасціся бензінам з бака нядаўна купленых службовых "жыгулёў". Напэўна, па неасцярожнасці нехта са злачынцаў кінуў на падлогу, дзе праліўся крадзены бензін, запалены сернік. Ад узнікшага пажару "жыгулі" згарэлі поўнасцю, дзве астатнія машыны вяскоўцам удалося ўсё ж выкаціць. Падазрэнне ў злачынстве падае на падлеткаў, якім захацелася выкрасці бензін для ўласных матацыклаў. Па гэтым факце ўзбуджана крымінальная справа.

Трэцяе ўзгаранне ўзнікла ў бункеры для захоўвання камбікармоў на дзяржаўнай племптушкафабрыцы паблізу вёскі Селішча, але намаганнямі прыбыўшых пажарнікаў агонь удалося збіць, хоць пэўныя страты ён нанёс.

Усяго ў тую ноч былі задзейнічаны чатыры машыны ваенізаванай пажарнай службы горада і адна — з Капыля.

Мікола КУТНЯВЕЦКІ.
г.Слуцк.

Падвёў залаты ланцужок

Гадзіннік "Арыент" і залаты ланцужок сталі штуршком для бясслаўнага завяршэння ваеннай кар'еры камандзіра аддзялення і камандзіра ўзвода адной з вайсковых часцей Брэста.

Як паведамілі БелаПАН у прэс-службе Брэсцкага аблвыканкама, менавіта гэтыя прадметы прыцягнулі ўвагу ваеннаслужачых, калі ў адну з ліпеньскіх начэй яны сустрэлі на вуліцы 26-гадовага брэстаўчаніна. Маладыя людзі злупцавалі прахожага, забралі ў яго гадзіннік і сарвалі з шыі ланцужок, утрыманне золата ў якім складала 58 грамаў. Пацярпелы звярнуўся ў Ленінскі РАУС, што і дапамагло вельмі хутка затрымаць злачынцаў. Скрадзенае было пры іх, таму вернута пацярпеламу ў цэласці. Супраць ваеннаслужачых узбуджана крымінальная справа.

Валянціна КАЗЛОВІЧ.

Крадуць кароў ад адчаю

Апошнім часам супрацоўнікі праваахоўных органаў Віцебшчыны сутыкнуліся з не распаўсюджанай раней з'явай. Прама з пашаў і калгасных фермаў пачалі знікаць жывёлы. Калі раней каровы і коні прападалі ў прыбалтыйскім накірунку, то цяпер ялавічына вывозіцца ў Расію. На працягу некалькі дзён у канцы чэрвеня ўкралі бычка ў калгасе "Чырвоны партызан" Расонскага раёна, потым рэшткі прырэзанай каровы адшукалі ў кустах у аднайменнай гаспадарцы суседняга Полацкага раёна. Быццам скрозь зямлю праваліўся жарабец у Аршанскім раёне. Гэтым дзіўным з'явам ёсць тлумачэнне. На канец першага месяца лета ў 203 калгасах і саўгасах вобласці, ледзь ці не палове існуючых, не атрымалі нават красавіцкай зарплаты. Дарэчы, у структуры крадзяжоў у многіх месцах пачалі пераважаць менавіта крадзяжы ежы.

Уладзімір ШЫТАЎ.

Спорт

У Кантынентальным кубку — ператасоўкі

У падгрупе Кантынентальнага кубка па хакеі, у якой гуляе мінскае "Юнацтва", адбыліся змены. Пасля жараб'ёўкі, спасылаючыся на фінансавыя праблемы, удзельнічаць у спаборніцтвах адмовілася ізраільская "Метула". У сувязі з гэтым аргкамітэт турніру замест яе заявіў іспанскую "Пігсерду". Праўда, затым ізраільцяне змянілі сваё рашэнне і згадзіліся ўдзельнічаць у розыгрышы кубка, але ў другой падгрупе.

Такім чынам, сапернікамі мінчан у 1/8 фіналу будуць французскі "Ліён", галандскі "Белфе Тайгерс" і "Пігсерда". На думку галоўнага трэнера "Юнацтва" Міхаіла Захарава, гэтыя змены ў падгрупе амаль не паўплывалі на расстаноўку сіл. Па-ранейшаму асноўным сапернікам яго падапечных за выхад у наступны круг спаборніцтваў будуць французы, якія маюць перавагу — "родныя сцены".

Згуляе ў Кантынентальным кубку і гродзенскі "Нёман", які, праўда, пачне турнір адразу з паўфіналу. Як стала вядома карэспандэнту БелТА, 15 ліпеня хакеісты каманды выходзяць з водпуску і пачнуць лядовую падрыхтоўку, якая ў сувязі з рэканструкцыяй Лядовага палаца ў Гродне пройдзе ў Мінску. Аднак да міжнароднага турніру чэмпіён Беларусі прыме яшчэ ўдзел у Кубку "Спартака" ў Маскве.

Вячаслаў ДУТАЎ.

Знакомьтесь!

Яанус ВАРУ:

"Путь, который выбрала Эстония, зарекомендовал себя довольно успешным. В это я верю..."

Наш собеседник — глава генерального консульства Эстонской Республики в Минске г-н Яанус ВАРУ.



— Господин консул, видимо, находясь в Беларуси, Вы часто вспоминаете Эстонию?

— Сильнее всего мне вспомнилась Эстония совсем недавно, когда около Раубичей община эстонцев в Беларуси организовала Купалье. Праздник проходил на берегу очень красивого озера, которое находится между маленькими холмами. Был большой костер, играла музыка. И именно тогда я почувствовал себя совсем как дома. Я родом с юга Эстонии, и это место было очень похоже на мои родные места.

— Прыгали через костер?

— Конечно. Это обязательная традиция. По поверью, это на целый год отгоняет от тебя всех злых духов...

— Существует расхожее мнение, что Эстония из всех стран бывшего СССР дальше всех пошла по пути реформ и демократии. Господин консул, читателям "Народной воли" было бы интересно узнать об уровне жизни в нынешней Эстонии. Какова минимальная и средняя заработная плата, размеры пенсий, социальных пособий?

— Лестно слышать, что Эстония шагнула дальше всех. Эстонцы и сами любят об этом подумывать. В 1998 году в Эстонии средний доход на одного члена семьи составлял 1889 крон. Это примерно 130 долларов. Средняя заработная плата — около 300 долларов. Средняя пенсия — около 100 долларов. Пособие по случаю рождения ребенка — порядка 200 долларов, и потом выплачивается ежемесячно по 30—50 долларов до восемнадцати лет. Минимальная заработная плата — порядка 80 долларов.

Эстонию формально можно разделить на два региона — Таллинн и вся оставшаяся территория. Большинство иностранных инвестиций пришли именно в Таллинн и его окрестности. Все банковские учреждения, главные офисы находятся в Таллинне. И поэтому в столице заработки значительно выше, чем в среднем по стране.

— Иностранные инвестиции пришли к Вам в основном из северных стран?

— 66% всех инвестиций пришли к нам от северных соседей. Уровень иностранных инвестиций в Эстонии уже превысил 29,4 миллиарда эстонских крон. На одного человека — это 1400 американских долларов. Среди наших инвесторов первое место занимает Швеция, которая вложила в Эстонию 10,8 миллиарда эстонских крон. Потом идет Финляндия — 8,8 миллиарда эстонских крон, затем — США, Дания, Норвегия. Если сравнить Эстонию с другими государствами средней Европы, то по уровню иностранных инвестиций наша страна "обошла" Чехию и находится на втором месте после Венгрии.

— Вероятно, есть определенные причины этого?

— После восстановления независимости Эстония выбрала курс на очень либеральную экономику. У нас до сих пор нет таможенных сборов. Вся торговля идет свободно, без всяких преград. Эстония очень активно заключает договора о свободной торговле, и это создает условия для иностранного капитала. Начиная с 1 января 2000 года, будет упразднен налог на прибыль с юридических лиц.

— В предвыборной программе лидера БНФ Зенона Позняка упоминалось об Эстонии и говорилось о том, что Беларуси стоит пойти по ее пути развития. Как Вы считаете, насколько реален для Беларуси эстонский путь?

— Я здесь только один год, и мне трудно судить, какой путь развития для Беларуси подходит больше всего. Путь, который выбрала Эстония, зарекомендовал себя довольно успешным. В это я верю... Мы первые из стран бывшего СССР успешно провели денежную реформу летом 1992 года. У нас по закону государственный бюджет не может быть отрицательным. Вся денежная масса должна быть на 100% гарантирована золото-валютным запасом. Сейчас наши специалисты передают эстонский опыт другим странам. Например, Украине. Они помогали совместно с другими странами подготовить там денежную реформу.

— А Беларуси?

— Беларусь сейчас довольно хорошо сотрудничает с Литвой и Польшей. Хотя Эстонии есть что передать Беларуси. Например, в сфере обучения. Мы первыми из бывшего Союза полностью сделали свою программу обучения. У нас есть очень хороший проект по Интернету, так называемый "Тигровый прыжок", который предусматривает подключение всех школ к Интернету к 2000 году и создание в них компьютерных классов. Между прочим, по прямому подключению к Интернету Эстония занимает в Европе 14-е место, опережая такие страны, как Франция, Германия.

— А на каком месте Вы находитесь по количеству мобильных телефонов?

— Где-то на одиннадцатом. В Европе на первом месте по подключению к Интернету и мобильным телефонам находится Финляндия. А наши столицы разделены только восьмьюдесятью километрами Финского залива.

— В Беларуси пока что нет посольства Эстонии. Чем это объяснить? Формальными, натянутыми отношениями между нашими странами, тем, что Беларусь не входит в сферу политических интересов Эстонии или чем-то другим?

